ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 1 (1151) ● 6 студзеня 1977 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

СПРАВАЗДАЧА АБ ПАСЯДЖЭННІ ПАРТКОМА І САВЕТА ● СТАНАЎЛЕННЕ КАЛЕКТЫВУ ● КЛУБ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДРУЖБЫ ● КАЛІ ТЫ ХОЧАШ СТАЦЬ ВЫДАТНІКАМ ● ГРАМАДСКАЯ ПРАКТЫКА СТУДЭНТА ● АПЕРАЦЫЯ «ДОЎГ» ПРАЦЯГВАЕЦЦА ● ГАРАЧАЕ ЖАДАННЕ ТАНЦАВАЦЬ ● РОЗДУМ ПАСЛЯ СПЕКТАКЛЯ

# РАЗВІВАЦЬ КРЫТЫКУ І САМАКРЫТЫКУ

## (З ПАСЯДЖЭННЯ ПАРТЫЙНАГА КАМІТЭТА І САВЕТА УНІВЕРСІТЭТА)

**Партыйная арганізацыя нашага універсітэта, кіруючыся рашэннямі XXV з'езда партыі і патрабаваннямі пастановы ЦК КПСС «Аб стане крытыкі і самакрытыкі ў Тамбоўскай абласной партыйнай арганізацыі», удзяляе вялікую ўвагу развіццю крытыкі і самакрытыкі як аднаму з важнейшых сродкаў паспяховага ажыццяўлення задач камуністычнага будаўніцтва. Аб узмацненні ролі і дзейснасці крытыкі і самакрытыкі ў паляпшэнні якасці і эфектыўнасці работы партыйных арганізацый, дэканатаў, кафедр, аддзелаў і служб па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў днямі ішла сур'ёзная, дзелавая размова на сумесным пасяджэнні парткома і савета універсітэта. З дакладам выступіў сакратар парткома М. С. Гарашчук.**

Распрацаваная XXV з'ездам КПСС праграма сацыяльнага і эканамічнага развіцця краіны ў дзесятай пяцігодцы, сказаў ён, вызначыла новыя важныя задачы па далейшаму развіццю вышэйшай адукацыі, паляпшэнню якасці падрыхтоўкі і ідэйна-палітычнага выхавання маладых спецыялістаў, павышэнню эфектыўнасці навукі ў ВНУ. У святле гэтых задач рэктарат, партком і грамадскія арганізацыі намецілі мерапрыемствы па ажыццяўленню рашэнняў XXV з'езда партыі. Такія мерапрыемствы распрацаваны таксама на факультэтах, кафедрах. Сёння калектыў універсітэта ў цэлым паспяхова выконвае іх.

Поспехі ў нас ёсць, аб іх прыемна гаварыць, але нам трэба сёння сканцэнтраваць увагу на нявырашаных пытаннях, недахопах і недаглядах. Замацаваць дасягнутае, яшчэ шырэй разгарнуць пошук рэзерваў — вось галоўная мэта, якой павінна служыць уся арганізатарская і выхаваўчая работа камуністаў, усяго калектыву.

Кастрычніцкі (1976 г.) Пленум ЦК КПСС, даючы разгорнутую характарыстыку і палітычную ацэнку дзесятага пяцігадовага плана, раскрыў шляхі далейшай рэалізацыі рашэнняў XXV з'езда партыі. Пры гэтым дакладна акрэслены раšаючыя ўчасткі работы, якія патрабуюць найбольшай увагі, найбольшай канцэнтрацыі сіл сёння.

Асноўная задача — гэта барацьба за якасць і эфектыўнасць работы. Яе можна сфармуляваць так: трэба навучыцца найбольш эфектыўна змагацца за павышэнне эфектыўнасці. Барацьба за эфектыўнасць і якасць, як сказаў на кастрычніцкім (1976 г.) Пленуме ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў, азначае, што кожны камуніст, кожная партыйная арганізацыя павінны ўсяляк заахвочваць і распаўсюджваць сапраўды дзелавыя і карысныя пачыны, рашуча ліквідоўваць усё тое, што перашкаджае нашаму руху наперад.

У цэлым у нас здаровы калектыў, здольны рашаць пастаўленыя перад ім задачы, самакрытычна ацэньваць вынікі работы. У сваім дакладзе я хацеў бы закрануць і асобныя недахопы, недагляды.

У апошнія гады шмат непрыемнасцей прыносяць нам студэнцкія інтэрнаты. Мы разумеем, што падтрыманне ўнутранага парадку ў інтэрнаце, у якім пражывае больш як 1000 чалавек, справа не простая. Мы разумеем цяжкасці іх гаспадарчага забеспячэння. Незразумела іншае — маштабы парушэння пры засяленні інтэрнатаў, бескантрольнасць.

Па штатнаму раскладу ў штаце студгарадка ёсць 8 адзінак, якія павінны непасрэдна займацца ўсімі пытаннямі інтэрнатаў. На жаль, 5 ставак студгарадка перададзена ў іншыя падраздзяленні гаспадарчай часткі. На застаўшыяся стаўкі падабраны людзі, якія не адпавядаюць, як паказаў час, па сваіх дзелавых і маральных якасцях пасадам кіраўнікоў студгарадка. Справа з засяленнем заблытана так, што немагчыма разабрацца, хто і дзе жыве і па якому праву. Кіраўнікамі студгарадка заселена каля 200 студэнтаў, якім дэканаты не прадаставілі інтэрната. Рэктарату неабходна тэрмінова рашыць пытанне аб кадрах студгарадка. Парткому і мясцкому неабходна даць прынцыповую ацэнку дзеянняў асоб, якія допусцілі парушэнні.

Вопыт паказвае, што калектыў больш паспяхова спраўляецца з усімі сваімі складанымі задачамі толькі ў тым выпадку, калі ў ім створан неабходны для творчай працы маральна-псіхалагічны клімат, пануе высокая патрабавальнасць да сябе і іншых, здаровыя ўзаемаадносіны падначаленых і кіраўнікоў.

У сучасных умовах здаровыя якасці калектыву выяўляюцца на здольнасці кожнага чалавека даваць прынцыповы бой любым праявам парушэння дысцыпліны, упушчэнням, памылкам. Суровая крытыка, калі яна аб'ектыўная і добразычлівая, зыходзіць з задач калектыву, заўсёды дапамагае справе. Мы павінны адрозніваць крытыку ад крытыканства. Крытыка павінна быць абгрунтаванай, карыснай, змяшчаць канструктыўныя прапановы.

Усім вядомы нездаровыя абставіны на кафедры паліт-эканоміі гуманітарных факультэтаў. Да разрадкі ўзаемаадносін паміж дацэнтам гэтай кафедры А. Кузьмічовым і загадчыкам кафедры В. Драчовым прыцягваюцца ўсё новыя і новыя адміністратыўныя і партыйныя органы. У лістападзе гэтага года бюро Кастрычніцкага РК КПБ зацвердзіла рашэнне парткома універсітэта ад 19 мая 1976 г. і аб'явіла А. Кузьмічову вымову з занясеннем ва ўліковую картку за праяўленую бестактоўнасць, абразу ў навуковай спрэчцы і нездаровае рэагаванне на крытыку. Разам з тым, бюро райкома даручыла рэктарату, парткому універсітэта вывучыць абставіны на кафедры паліт-эканоміі і прыняць меры для паляпшэння навуковай і вучэбна-выхаваўчай работы.

Асобая роля ў развіцці крытыкі і самакрытыкі належыць партыйным сходам, сходам грамадскіх арганізацый, насценнаму і універсітэцкаму друку, народнаму кантролю.

Неабходна пастаянна заслухоўваць справаздачы кіраўнікоў калектываў, падраздзяленняў. Прынцыповае абмеркаванне і змястоўны характар крытыкі і самакрытыкі з'яўляецца істотным паказчыкам баявітасці партыйнай арганізацыі, актыўнай пазіцыі камуністаў.

На сходах і ў калектывах неабходна ствараць такія абставіны, каб не было фактаў нават замаскіраванага зажыму крытыкі. Кожны камуніст, кожны член калектыву павінен быць упэўнены: яго выступленне будзе падтрымана, сустрэта з разуменнем.

Ва ўсіх партыйных арганізацыях універсітэта адбыліся сходы па пытанню развіцця крытыкі і самакрытыкі з аналізам спраў у калектывах у святле адпаведных пастаноў Пленумаў ЦК КПСС і ЦК КПБ. Па-дзелавому яны прайшлі на філалагічным, фізічным, гістарычным і некаторых іншых факультэтах. Асобна хацелася б адзначыць сход філалагічнага факультэта, змястоўныя крытычныя выступленні на ім дэкана А. Волка, сакратара партбюро І. Ключановіч, а таксама іншых.

Крытыкаваць належыць не толькі тых, хто робіць памылкі, але і тых, хто не выкарыстоўвае ўсіх магчымасцей для далейшага паляпшэння работы. Пакуль жа няма энтузіязму і баявітасці ў рабоце дэканата факультэта па навучанню замежных студэнтаў.

Кадравыя пытанні павінны быць у цэнтры ўвагі партыйных арганізацый. Кадры — ключавое звяно партыйнага кіраўніцтва. Партком зацвердзіў наменклатуру парткома і партбюро, г. зн. зацвердзіў пералік найбольш важных пасад, кандыдатуры на якія папярэдне разглядаюцца, рэкамендуюцца, зацвярджаюцца парткомам, адпаведна партбюро.

Важную ролю ў стварэнні добрай атмасферы ў калектыве адыгрываюць кіраўнік, стыль і метады яго дзейнасці, прынцыповасць, чуласць, правільнае разуменне значэння крытыкі і самакрытыкі, крытыкі знізу.

# ПАСТАНОВА ПАРТЫЙНАГА КАМІТЭТА І САВЕТА УНІВЕРСІТЭТА

Кіруючыся патрабаваннямі XXV з'езда партыі, пастановай ЦК КПСС «Аб стане крытыкі і самакрытыкі ў Тамбоўскай абласной партыйнай арганізацыі», пастановай ЦК КПБ «Аб рабоце Віцебскага абкома КПБ па развіццю крытыкі і самакрытыкі ў святле рашэнняў XXV з'езда партыі і пастановы ЦК КПСС «Аб стане крытыкі і самакрытыкі ў Тамбоўскай абласной партыйнай арганізацыі», забяспечыць ва ўсіх калектывах усямернае развіццё прынцыповай, сапраўды партыйнай крытыкі і самакрытыкі.

Партыйным арганізацыям, дэканатам, кафедрам, аддзелам і службам ліквідаваць недахопы, адзначаныя ў гэтай пастанове.

Арганізацыям, дэканатам, кафедрам, аддзелам і службам удасканальваць работу ў калектывах, выпрацоўваць у кадраў усіх звенняў самакрытычны падыход да вынікаў сваёй дзейнасці і на гэтай аснове павышаць эфектыўнасць і якасць работы. Дабівацца, каб прынцып патрабавальнасці стаў нормай жыцця, каб усе бакі дзейнасці калектыву, усіх работнікаў атрымлівалі аб'ектыўную ацэнку, існуючыя недахопы падвяргаліся ўсебакованаму крытычнаму аналізу і неадкладна ліквідаваліся. Для развіцця крытыкі і самакрытыкі ўсямерна выкарыстоўваць партыйныя сходы, сходы грамадскіх арганізацый, універсітэцкі і насценны друк і іншыя формы. Арганізаваць строгі ўлік і кантроль за ажыццяўленнем выказаных камуністамі прапаноў, перыядычна інфармаваць калектывы аб ходзе выканання крытычных заўваг, прапаноў і рашэнняў партыйных сходаў і іншых партыйных дакументаў.

Парткому, рэктарату, партыйным арганізацыям, дэканатам уважліва падыходзіць да падбору кадраў, пры гэтым асаблівую ўвагу звяртаць на прафесійную падрыхтоўку, на маральна - палітычныя і дзелавыя якасці. Пры падборы кадраў строга кіравацца наменклатурай, зацверджанай парткомам універсітэта.

Рэктарату універсітэта да 25 студзеня 1976 года рашыць пытанне аб кадрах студэнцкага гарадка; адміністрацыі студэнцкага гарадка пры выдзяленні месц улічваць думку грамадскіх арганізацый, дабівацца паляпшэння ўсёй ідэйна-выхаваўчай работы ў інтэрнатах, прытрымлівання ўзорнага парадку і дысцыпліны. Рэктарату, дэканатам строга сачыць і не дапускаць дубліравання пры размеркаванні месц у інтэрнаце, падмены функцый іншых арганізацый.

Партыйным арганізацыям, адміністрацыі ўсіх структурных падраздзяленняў няспынна ўдасканальваць формы і метады сваёй дзейнасці. Усім кіраўнікам служб, аддзелаў, падраздзяленняў дакладна вызначыць час прыёму розных катэгорый супрацоўнікаў па службовых і асабістых справах, уважліва рашаць пастаўленыя імі пытанні.

Партыйным арганізацыям, дэканатам, кафедрам, аддзелам і службам удасканальваць сістэму інфармацыі. Практыкаваць выступленні кіруючых работнікаў універсітэта перад калектывамі факультэтаў і структурных падраздзяленняў. Перыядычна інфармаваць камуністаў, усіх супрацоўнікаў універсітэта аб важнейшых падзеях у БДУ, задачах усяго калектыву ВНУ.

Рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт» шырока асвятляць на сваіх старонках пытанні развіцця крытыкі, самакрытыкі, падвяргаць крытыцы недахопы ў жыцці універсітэцкага калектыву і дабівацца своечасовага рэагавання на крытычныя выступленні.



Наш універсітэт наведаў міністр вышэйшай адукацыі Рэспублікі Куба Фернанда Бесіна Алігрэт, які знаходзіўся некаторы час у Савецкім Саюзе.

**НА ЗДЫМКУ:** прарэктар па вучэбнай рабоце БДУ **А. МАЛЫШАЎ**, намеснік дырэктара вылічальнага цэнтра БДУ **Л. ЗАЛАТАРЭВІЧ** і кубінскі міністр **ФЕРНАНДА БЕСІНА АЛІГРЭТ** у вылічальным цэнтры універсітэта.

Фота У. Будая.

# ГРАМАДСКУЮ ПРАКТЫКУ—НА ВЫДАТНА!

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва мінулага навучальнага года камсамольская арганізацыя філфака заняла першае месца ва універсітэце і была ўзнагароджана пераходным вымпелам камітэта камсамола БДУ. Адным з плюсаў, які дазволіў камсамольцам факультэта выйсці ўперад, з'яўляецца іх грамадска-палітычная практыка, якая праходзіць звычайна на высокім узроўні таму, напэўна, што за справу камсамольцы факультэта ўзяліся сапраўды па-камсамольску, з агеньчыкам.

Некалькі пытанняў члену ідэалагічнага сектара камітэта камсамола філфака Віктару Каратаю:

**— Усёй грамадска-палітычнай практыкай студэнтаў на факультэце кіруе камсамол. Якім чынам здзяйсняецца гэта кіраўніцтва?**

— Сапраўды, гэтай справай займаецца ў нас камітэт камсамола. На факультэце створана лектарская група. Яна налічвае каля трыццаці членаў. Студэнты гэтай групы чытаюць лекцыі перад сваімі таварышамі, перад студэнтамі малодшых курсаў. Тэматыку лекцый, планы работы групы зацвярджае камітэт камсамола. Кожны член групы павінен трымаць справаздачу на пасяджэнні бюро камітэта аб сваёй рабоце, прадстаўляць рэфераты сваіх выступленняў. У час зімовых канікул грамадска-палітычную практыку праходзяць не толькі члены лектарскай групы: прымаюць удзел усе студэнты факультэта. У мінулым годзе ўсяго было прачытана каля 500 лекцый. Вынікі агітацыйна-прапагандысцкай работы падводзяцца пры грамадска-палітычнай атэстацыі камсамольцаў. Выкрываюцца і недахопы. Некаторыя студэнты нядобрасумленна адносяцца да даручэнняў. У лекцыях недасканала раскрываюць тэму, слаба рыхтуюцца да іх. Гэтым студэнтам даецца атэстацыя з заўвагай. З такімі недахопамі змагаецца наш камітэт камсамола.

**— Як плануюцца тэмы лекцый? Якая іх мэтанакіраванасць?**

— Па-першае, мы выбіраем тэмы актуальныя, тэмы сучаснага жыцця краіны, партыі. Мінулы навучальны год быў годам XXV з'езда КПСС. Тэматыка лекцый была ў асноўным звязана з рашэннямі гэтага форуму камуністаў. Па-другое, вядзецца вялікая работа па прафарыентацыі. Студэнты выступаюць у сваіх родных школах з дакладамі аб БДУ, аб факультэце. Можна адзначыць добрую работу Тамары Купрэвіч, студэнткі V курса беларускага аддзялення. Кожны год на канікулах выступае яна ў Мядзельскай сярэдняй школе. Яе лекцыі слухаюць вучні з вялікім задавальненнем. У выніку — кожны год да нас на факультэт паступаюць выпускнікі з гэтай школы.

Іна Янушкевіч, яе аднакурсніца, выступае перад вучнямі школ Мінска. У адрас гэтых студэнтак на факультэт паступаюць пісьмы-падзякі.

Асноўная мэта практыкі — выхаваць студэнтаў сапраўднымі будаўнікамі камунізму, навучыць іх актыўнаму ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці, прывіць навыкі грамадскай работы.

**— Каб стаць добрым лектарам, трэба вучыцца. Як камсамольцы павышаюць сваё лектарскае майстэрства?**

— Нельга не згадзіцца з тым, што ў нас ёсць яшчэ слабыя выступленні. І іншы раз гэты недахоп не ад таго, што матэрыял да выступлення знойдзен нецікавы, а ад таго, што лектар не можа добра «падаць» яго слухачу.

Павышэнню якасці дакладаў удзяляецца вялікая ўвага. У нас ёсць бібліятэчка, дзе члены групы знойдуць неабходны матэрыял. Праводзяцца конкурсы на лепшага лектара, на лепшую палітінфармацыю. Ідзе абмен вопытам. Многія студэнты займаюцца на факультэце грамадскіх прафесій. Там пад кіраўніцтвам вопытных лектараў яны вучацца майстэрству валодання словам.

В. ДУДКО, студэнт 1-га курса журфака.

НАПЯРЭДАДНІ СЕСІІ

# ПАТРЭБНА ПРАГА ПАЗНАННЯ



АДКУЛЬ бяруцца тройкі? Гутарка ідзе, канешне, не аб выпадковай тройцы, якую студэнт атрымлівае адзін раз за пяць гадоў, а аб тройцы сістэматычнай, своеасаблівай «столі» ведаў у некаторых студэнтаў.

У чым жа прычына: не могуць, не хочуць, не ўмеюць вучыцца нашы троечнікі?

Тут можна выдзеліць дзве катэгорыі троечнікаў: гультаі і неарганізаваныя.

Якасць будучых спецыялістаў у многім вызначаецца зацікаўленасцю студэнтаў у высокім прафесіяналізме па выбранай спецыяльнасці, таму што цяжка паверыць, каб чалавек выпадковы, апантаны толькі жаданнем атрымаць дыплом, атрымаць усё роўна якую, абы вышэйшую адукацыю, стане сур'ёзна вучыцца. Для такога самае прывабнае ў гады навучання — магчымасць пабраваць, пахваліцца тым, што ён студэнт, весела правесці час з сябрамі па групе і факультэту. Як правіла, такі студэнт бачыць у тройцы мяжу сваіх жаданняў — «абы не выгналі». Але такіх у нас параўнальна мала.

Большасці студэнтаў перашкаджае няўменне працаваць, няўменне арганізаваць распарадак дня, перашкаджае адсутнасць сістэмы вучобы — і, як вынік, тройка — часты госць у іх заліковках. Таму не выпадкова ў апошні час гавораць аб навуковай арганізацыі працы ў ВНУ, адаптацыі і акліматызацыі першакурсніка, аб тым, што студэнтаў неабходна вучыць працаваць.

Але калі навучыць студэнтаў карыстацца літаратурай няцяжка, то навучыць студэнта вучыцца складаней. Кожны павінен выпрацаваць свой уласны метад, сваю ўласную сістэму падрыхтоўкі да заняткаў і экзаменаў. Простае запазычанне звычайна нічога не дае, калі сам студэнт не імкнецца да таго, каб умець вучыцца.

Цяга да ведаў, неабходнасць ведаць новае заўсёды лічацца неад'емнымі рысамі студэнта, але, на жаль, далёка не аб усіх студэнтах нашага універсітэта можна сказаць такое. Надта вялікая ў некаторых самазаспакоенасць, імкненне пражыць з найменшымі затратамі фізічнай і духоўнай энергіі. Гэта датычыцца не толькі вучобы. Вельмі дарэчы ўспомніць тут словы У. І. Леніна: «Калі я ведаю, што ведаю мала, я даб'юся таго, каб ведаць больш, але калі чалавек будзе гаварыць, што ён камуніст і што яму і ведаць нічога не трэба трывалага, то нічога падобнага на камуніста з яго не выйдзе».

Гэта, без сумнення, адносіцца і да камсамольцаў. Любоў да вучобы вельмі важная, таму што нават ад вельмі стараннага чалавека толку будзе мала, калі выбраная спецыяльнасць яму не па душы, бо поспех прыходзіць толькі тады, калі адчуваеш радасць і цікавасць да вучобы. Вучэнне павінна ўваходзіць у жыццё арганічнай і нясумнай часткай.

Вялікая падтрымка ў вучэнні — агульная эрудыцыя і культура чалавека. Што датычыцца першага, то вельмі мала чытаюць у нас, і не толькі спецыяльнай і палітычнай, але нават і мастацкай літаратуры.

Дзе не хочуць чытаць, там не хочуць і ведаць, а дзе не хочуць ведаць, там вынік у лепшым выпадку — тройка.

Што датычыцца культуры, то і тут не ўсё ў нас у парадку. Набалеўшае пытанне — дысцыпліна — таксама адыгрывае не апошнюю ролю ў паяўленні тройкі. Сёння студэнт прапусціў лекцыю, заўтра — семінар. А прагалы ў ведах не заўсёды можна ліквідаваць самастойна часта амаль немагчыма; яны накопліваюцца, ліхаманка перад экзаменамі не выратоўвае — і зноў тройка.

Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў у прамове на Усесаюзным злёце студэнтаў зрабіў упор на тое, што лацінскае слова «студэнт» слоўнікі растлумачваюць як «старанна працуючы, прагнучы ведаў».

Так, галоўнае прызначэнне студэнта — вучыцца. І вучыцца з прагай пазнання, з усведамленнем адказнасці перад сваёй Радзімай. Толькі ў гэтым выпадку можна быць не троечнікам, а выдатнікам, не пасрэдным, а высокакваліфікаваным спецыялістам.

Т. ПАЧКОЛІНА.

Камсорг і група

# КАБ СТАЦЬ КАЛЕКТЫВАМ

Калі Алег Хаткевіч, камсорг 3-й групы III курса фізфака, расказваў аб сваёй групе, аб пытаннях, якія яе хвалююць, ён вельмі сабраны, сур'ёзны і засяроджаны. Адчуваецца, што гэта тэма яго глыбока хвалюе.

**— Алег, на чым, па-твойму, павінны будавацца адносіны паміж камсоргам і групай?**

— Поўны давер, узаемаразуменне і павага — вось, па-мойму, галоўнае, што неабходна ў адносінах камсорга і групы. Камсорг павінен адчуваць, што група яго заўсёды падтрымае, а група — што камсорг ніколі не прыме памылковага рашэння.

**— Што робяць бюро і асабіста ты, каб справы групы не проста адзначаліся «галачкай» у плане мерапрыемстваў, а каб яны запомніліся, былі неабходнымі і карыснымі?**

— Усе мерапрыемствы плануюцца ўсёй групай. Такім чынам, іх здзяйсненне — гэта ажыццяўленне ўласных жаданняў, а гэта заўсёды цікава.

**— Група ў сценах універсітэта і па-за ім. Ці застаецца яна адзінай і з'яднанай?**

— Наша група толькі стварылася (на III курсе пачынаецца спецыялізацыя). Сабраліся людзі з розных груп, патокаў. Але вось мы правялі тры сходы, і адразу адчулася, што ўсе імкнуцца быць разам. Калі абмяркоўваем свае справы — абыякавых не бывае. Плануем на вольны час і агульныя вечары, і паездкі за горад... Думаю, пачаткі калектыву ў нас ёсць.

**— Здараецца, што група нагадвае аўтобус, у якім усім як быццам і ў адзін бок (маршрут агульны), але кожны едзе па сваіх справах. Што рабіць тады?**

— На першых курсах гэта амаль тыпова. Вельмі проста тлумачыцца: ва універсітэт прыйшлі людзі з розных месц, часта зусім рознага ўзросту, са сваімі інтарэсамі, праблемамі. Што-небудзь змяніць аднаму чалавеку (напрыклад, камсоргу) амаль немагчыма. Трэба брацца за стварэнне калектыву ўсёй групай. Неабходны агульныя мерапрыемствы з абавязковым поўным адабрэннем і ўдзелам кожнага.

**— І, нарэшце, твае пажаданні камсоргам-першакурснікам, якія яшчэ мала ведаюць аб студэнцкім жыцці?**

— Не проста «адбываць» часы ва універсітэце — вучыцца. Ведаць: што мы атрымаем тут—тое і панясём у жыццё.

Да камсорга заўсёды прад'яўляюць павышаныя патрабаванні. Ён павінен быць першым, каб заслужыць аўтарытэт. Але не абмяжоўваць сябе толькі вучобай, інакш за пяцёркамі можна прагледзець групу, сваіх сяброў. Наогул, мала быць проста добрым чалавекам—трэба апраўдаць давер тваіх аднакурснікаў.

Інтэрв'ю правяла К. НАТАЛЫНА.



Наталля Косарава вучыцца на II курсе факультэта журналістыкі. Дзяўчына паспявае ўсюды — і ў вучобе (яна вучыцца на выдатна), і ў грамадскай рабоце. Косарава — камсорг групы.

Фота А. Басава

КЛУБ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДРУЖБЫ

# ФЛЕЙТА СПЯВАЕ АБ РАДЗІМЕ

Шмат цікавых і разнастайных спраў у біёлагаў — членаў клуба інтэрнацыянальнай дружбы. Адметна тое, што ўсе мерапрыемствы «кідаўцаў» так або інакш звязаны з падзеямі сённяшняга дня.

Нядаўна члены інтэрклуба на чале з Вольгай Сычовай арганізавалі сустрэчу з в'етнамскімі студэнтамі. Вельмі ўсхвалявалі прысутных выступленні Ле Хыу З'ена, аспіранта мехмата і Ле Зунга, студэнта ФПМ. Яны падрабязна расказалі аб тых вялікіх задачах пераўтварэння В'етнама ў квітнеючую сацыялістычную дзяржаву, якія рашаюцца сёння ў краіне, аб тым, што робіцца ў галінах сельскай гаспадаркі і прамысловасці. Цікава было пачуць і пра будаўніцтва чыгункі «Адзінства», якая працягнецца праз увесь В'етнам — з поўначы на поўдзень.

...А потым в'етнамскія сябры чыталі вершы Хо Шы Міна, спявалі народныя песні, ігралі на флейце. Так, на самай сапраўднай бамбукавай флейце! У гуках яе, пяшчотных і таямнічых, была не толькі прыгажосць — у іх гучала мужнасць в'етнамскага народа, які адстаяў сваю незалежнасць у барацьбе з амерыканскімі агрэсарамі.

На памяць аб сустрэчы члены інтэрклуба падарылі в'етнамскім сябрам зборнік вершаў Сяргея Ясеніна і дыскі з запісамі беларускай музыкі. Госці ў сваю чаргу падарылі кнігу паэзіі Хо Шы Міна.

Але самым лепшым падарункам і для гасцей, і для гаспадароў была сама сустрэча, яе шчырая і сардэчная сяброўская атмасфера.

Т. ГАЎРУСЕВА.

# АДНАВІЦЬ ІМЁНЫ

Пры камітэце камсамола БДУ даўно працуе пошукавая група «Доўг». Штаб групы ўзначальвае студэнтка II курса гістарычнага факультэта Зінаіда Мельнік.

Пошукавая група «Доўг» вядзе збор матэрыялаў аб студэнтах і выкладчыках БДУ, якія прымалі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне. Галоўная мэта работы — стварэнне «Кнігі памяці». Мяркуецца ў будучым правядзенне злёту ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны — былых студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

Добра арганізавана пошукавая работа ў групах журфака і юрфака, якія ўзначальваюць студэнты Т. Чарнавус і А. Дзядок. Горш працуюць групы мехмата, фізфака і ФПМ.

— За кароткі тэрмін мы адшукалі звыш 20 адрасоў. Знайшлі былога ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны, а зараз рэдактара аднаго з выдавецтваў БССР Ануфрыя Ермалаевіча Дразда, — расказвае Т. Чарнавус.

Рабяты завязалі знаёмства з былым «звяздоўцам» Алесем Лявонавічам Матусевічам, з Іосіфам Фадзеевічам Ліўшыцам, які працуе ў рэдакцыі «Мінскай праўды», з Н. П. Рынкевічам, які жыве ў Падмаскоўі, і з іншымі. Добрую дапамогу ў пошуку аказалі выкладчыкі факультэта В. Пыжкоў і Г. Бягун.

Работа групы «Доўг» складаная, але захапляючая. Ёю займаюцца сапраўдныя энтузіясты, людзі, не абыякавыя да гісторыі свайго універсітэта, да людзей, якія знаходзяцца вакол іх.

— Але, — кажа З. Мельнік, — нас яшчэ не так многа, як хацелася. Мы думаем, што хутка ў пошук уключацца новыя члены, студэнты не толькі гуманітарных факультэтаў, а і прыродазнаўчых.

Аднавіць імёны барацьбітоў — наш свяшчэнны абавязак.

**М. ХАЛІМОНЧЫКАЎ.**

# Абрам Хаімавіч ШКЛЯР

Пасля цяжкай хваробы памёр вядомы савецкі вучоны-географ і кліматолаг, загадчык кафедры фізічнай геаграфіі СССР Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, доктар геаграфічных навук, прафесар Абрам Хаімавіч Шкляр.



А. Х. Шкляр нарадзіўся ў 1910 г. у вёсцы Магільнае Мінскай вобласці ў сям'і рамесніка. У 1931 годзе ён скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. У 1931—1935 гг. працаваў у Белкалгасцэнтры, Наркамземе, Дзяржплане БССР, у 1935—1940 гг. — выкладчыкам Мінскага педагагічнага інстытута. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

У Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна А. Х. Шкляр працаваў з 1940 года дацэнтам, прафесарам, загадчыкам кафедры. У 1964 годзе яму прысвоена вучоная ступень доктара геаграфічных навук, а ў 1965 годзе—вучонае званне прафесара. Будучы кваліфікаваным выкладчыкам, ён усё сваё жыццё прысвяціў падрыхтоўцы спецыялістаў-географаў, шмат увагі ўдзяляў арганізацыі вучэбна - метадычнай і навукова-даследчай работы.

А. Х. Шкляр—аўтар больш 100 навуковых работ, прысвечаных сельскагаспадарчай кліматалогіі, феналогіі, ахове прыроды, фізічнай геаграфіі, меліярацыі Палесся. Яго фундаментальныя працы «Клімат Беларусі і сельская гаспадарка» (1962 г.), «Сезоннае развіццё прыроды Беларусі» (1959 г.), «Кліматычныя рэсурсы Беларусі і выкарыстанне іх у сельскай гаспадарцы» (1973 г.), «Каляндар прыроды Беларусі» (1967 г.) і іншыя маюць вялікае навуковае і практычнае значэнне, добра вядомы далёка за межамі рэспублікі.

Як аднаму з аўтараў кнігі «Беларусія» (серыя «Савецкі Саюз»), а таксама за артыкулы ў зборніках «Ахова прыроды» і «Гутаркі аб прыродзе і грамадстве» Абраму Хаімавічу Усесаюзным таварыствам «Веды» прысуджаны два дыпломы I ступені і дыплом II ступені. А. Х. Шкляр з'яўляецца адным з аўтараў падручніка «Геаграфія Беларусі», вучэбнага дапаможніка «Прырода Беларусі», Атласа БССР. Многія яго артыкулы апублікаваны ў Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. У апошнія гады А. Х. Шкляр кіраваў навуковымі даследаваннямі па тэме «Уплыў меліярацыі Палесся на мікраклімат».

А. Х. Шкляр прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. На працягу многіх год ён з'яўляўся сакратаром партбюро, старшынёй метадычнай камісіі факультэта, членам навукова-тэхнічных саветаў Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па ахове прыроды, членам савета па праблемах Палесся АН БССР. Сістэматычна выступаў з лекцыямі перад насельніцтвам, аказваў вялікую дапамогу настаўнікам геаграфіі рэспублікі ў павышэнні кваліфікацыі.

Педагагічная і навуковая дзейнасць А. Х. Шкляра атрымала высокае прызнанне Радзімы, ён удастоен шэрагу ўрадавых узнагарод.

Светлая памяць аб Абраме Хаімавічу Шкляру назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

**Група таварышаў.**

# ЁСЦЬ ТАКАЯ ГРУПА

Кожнаму першакурсніку, якому, безумоўна, свая група здаецца самай лепшай, цікава даведацца, чым жывуць іншыя групы, як зрабіць студэнцкае жыццё разнастайным.

**Знаёмцеся: чацвёртая група біялагічнага факультэта БДУ. Год нараджэння: 1976.**

Група як група. Гэтакіх, напэўна, шмат ва універсітэце. Толькі спецыяльнасць у рабят вельмі ўжо цікавая — генетыка. Падрыхтоўка спецыялістаў па генетыцы ўведзена на факультэце ўпершыню, і таму займаюцца ёю па асобнаму вучэбнаму плану.

Для таго, каб больш даведацца аб групе, трэба пазнаёміцца з калектыўным інтэрв'ю-анкетай, запоўненай студэнтамі для насценгазеты «Аберацыя» (аберацыя — рух наперад, прагрэс).

Такім чынам...

— **Чаму вы выбралі генетыку?**

— Я проста не магу сябе ўявіць на іншым месцы. Генетыка для мяне — гэта нешта таямнічае, загадкавае і таму прывабнае, захапляючае.

У кожнага чалавека ёсць свая мара. Яна здзяйсняецца толькі тады, калі праходзіш праз усе выпрабаванні, няхай нават самыя цяжкія...

Чацвёртая група — 26 будучых генетыкаў. Каб расказаць, як цяжка было гэтым дваццаці шасці стаць студэнтамі, не трэба апісваць строгія твары экзаменатараў і складанасць уступных экзаменаў. Трэба проста назваць прахадны бал—24,5.

Успамінаючы былое, нехта на пытанне **«якія цяжкасці сустрэлі пры паступленні?»** адказаў: «Са скрытнымі тварамі, поўныя ведаў і абцяжараныя залатым медалём, яны ўваходзілі і выходзілі з задзёртым да столі носам, і тады я зразумеў: будзе цяжка».

Адказы на пытанне **«як уяўляеш сваю будучую прафесію?»** былі рознымі. Марылі аб вывядзенні новага сорту пшаніцы, барацьбе з урастаючымі наследнымі захворваннямі... «Грамадству будучага патрэбны здаровыя, моцныя людзі. І дапамагчы ім стаць такімі павінны генетыкі ў садружнасці з іншымі спецыялістамі», — пісалі ў адказах.

Але ўсё гэта яшчэ будзе, а пакуль — вучоба. І хаця спецыялізацыя пачнецца з III курса, але ўжо цяпер рабяты працуюць у навуковым гуртку па генетыцы.

Група яшчэ толькі складваецца. Але ў яе ёсць галоўнае — прынцып садружнасці. «Генетыкі» лічаць, што і ім самім, і іх куратару Міхаілу Сяргеевічу Марозіку патрэбна быць заўсёды разам, каб група стала іменна такой, якой хацеў бы яе бачыць кожны: вясёлай, дружнай. Каб заўсёды адчувалася плячо сябра.

**Т. ГУЦАВА,**
**студэнтка I курса журфака.**

# ШЧОДРАСЦЬ

## ШЧАСЦЕ БЫЦЬ ПАТРЭБНЫМ

У кожнага чалавека лёс складваецца па-рознаму. Адзін шукае сваю дарогу палову жыцця. А другі ўжо з дзяцінства ведае, кім хоча быць. Хоць і ўсё вабіць: сінія прасторы неба, прыгажосць прыроды, вялікая навука, але ёсць адзіная мэта ў жыцці, якой ты не здрадзіш ніколі. Як прыемна, калі адчуваеш, што сваёй працай прыносіш людзям і сабе радасць. Сустрэнешся з такім чалавекам — закахаешся ў яго прафесію. Здаецца, што і табе ён перадаў часцінку шчодрасці сваёй душы. Такі не падвядзе: заўсёды дасць параду, па-сяброўску дапаможа.

Вось, здаецца, я і пачаў расказваць пра Міхаіла Зарэцкага. Ён вучыўся ў нашым універсітэце на радыёфізічным факультэце, зараз працуе.

## АДКУЛЬ ПАЙШЛО...

Вырас Міша ў вёсцы Дзеткава, што на Віцебшчыне. І зараз бацька і маці яго працуюць у калгасе. З маленства хлапчук дапамагаў па гаспадарцы, у полі.

...Салодкі сон раніцай. Матчыны рукі ціхенька кранаюць коўдру: «Пара ўставаць. Праца чакае».

Ой, як не хочацца хлопцу падымацца з ложка. Але — трэба. А маці ўсё турбуецца: «Сыночак, ці добра ты апрануўся? Глядзі, якое надвор'е кепскае».

— Не замерзну.

А сам у думках: «Якая ў мяне маці цудоўная... Напэўна, адзіная яна такая на зямлі...».

— Не ведаю, як у каго, а ў мяне,—гаварыў мне Міхаіл, — на ўсё жыццё засталіся ў памяці дзіцячыя гады і пяшчотнасць, дабрата маёй маці.

Пэўна, гэтыя рысы—дабрата, чуласць — перайшлі да сына. Ён ніколі не пакіне чалавека ў гадзіну роспачы, дапаможа. Такі ўжо вырас...

## ПАКАРЫЦЬ ЧАС

Міша працуе ў ВТА імя У. І. Леніна. Прафесію сваю вельмі любіць. У калектыве яго цэняць за вялікую працавітасць і дружалюбнасць.

А вось што расказаў сябра Зарэцкага Фёдар:

— Міша часта гаворыць: дзе шмат слоў, там мала спраў. Я яго поўнасцю падтрымліваю. Усе мы імкнёмся зрабіць за дзень як мага больш. Але лепш гэта ўдаецца Міхаілу. Як ён усюды паспявае? Усё ў яго запланавана, усё як бы па палічках раскладзена. А яшчэ ён мне дарагі за шчырасць, працавітасць, мэтанакіраванасць. Праўду гавораць, што не гады збліжаюць сяброў, а хвіліны.

Міхаіл удачлівы—у рабоце і ў сябрах. Гэта ўдачлівасць — ад таго агеньчыка, які ўласцівы хлопцу, ад умення пакарыць час і не здавацца на літасць абставін.

Яго працоўныя рукі не ведаюць суму.

Прыйдзе дахаты і тут не ўседзіць. Рамантуе сябрам радыё, тэлевізары, магнітафоны.

Жыццё ў хлопца — рух. А галоўнае ў гэтым жыцці — любоў да людзей. І чалавека ён цэніць за працавітасць, дружалюбнасць.

Ёсць яшчэ адзін прынцып у Зарэцкага: ніколі не апускаць рукі, у самых цяжкіх сітуацыях быць бадзёрым, быць аптымістам. Выдатны прынцып!

**А. МАРЧУК.**

*Рэпартаж*

# ТАМ, ДЗЕ ЗДАБЫВАЮЦЬ ВЕДЫ

— Уявіце сабе наступную сітуацыю. Багаты купец вяртаецца дамоў і бачыць, што замкі скрыні ўзламаны і ўкрадзена трыста гульдэнаў. Падазраюцца двое...

— Можна, я вазьму на сябе ролю суддзі?

На першы погляд можа здацца, што ідзе рэпетыцыя спектакля драматычнага гуртка.

— Следства правесці на аснове судзебнага зборніка «Караліна»...

Цяпер ужо зразумела, што мы трапілі да студэнтаў юрыдычнага факультэта. Больш дакладна: I курс, 6-я група. У будучых юрыстаў ідуць практычныя заняткі па гісторыі дзяржавы і права замежных краін, і яны выконваюць заданне па тэме «Інквізітарскі судзебны працэс у Германіі ў перыяд абсалютызму».

Але так было ў канцы заняткаў, а перад гэтым студэнты разбіралі пытанне аб утварэнні саслоўна-прадстаўнічых манархій у краінах Заходняй Еўропы.

— Калі ласка, Галаскоў, раскажыце нам аб рэформах англійскага караля Генрыха II, — запрашае да адказу старшы выкладчык Людміла Васільеўна Паўлава.

Пакуль студэнт збіраецца з думкамі, хачу прывесці словы, якія пачула ў дэканаце юрфака:

«Людміла Васільеўна ў кожныя свае заняткі імкнецца ўнесці штосьці новае, пабудаваць іх так, каб усе студэнты ўдзельнічалі ў абмеркаванні пытанняў».

...Галаскоў адказвае ўпэўнена. Відаць, што хлопец добра разабраўся ў гэтым матэрыяле. Добрыя адказы таксама ў Міхаіла Карабейніка, Раі Дзянісавай.

Час перапынку. Я звяртаюся да старасты Мішы Кавалёва з просьбай расказаць аб сваёй групе.

— Сцвярджаць, што ў нас ужо склаўся калектыў, яшчэ нельга. Але рабяты выдатныя! У групе займаюцца трыццаць два студэнты, дваццаць адзін з іх — камуністы і кандыдаты ў члены партыі, астатнія — камсамольцы. Рыхтуюцца да заняткаў добрасумленна.

...Старанна схіліўся над кнігай Валерый Савасцьянчык, таропка гартаюць старонкі канспектаў хлопцы за апошнім сталом. Людміла Васільеўна добра разумее ўсе цяжкасці, што паўстаюць перад першакурснікамі. Акрамя таго, у 6-й групе займаюцца студэнты, якія прыйшлі на факультэт пасля доўгага перапынку ў вучобе (толькі адзін чалавек з групы скончыў школу сёлета).

— Так, займацца цяжка, але цікава. Паступова прывыкаем да рытму студэнцкага жыцця, — гаворыць Таня Красна-гір, — упэўнена, што сесію здадзім нядрэнна.

**Л. БУСЬКО.**

ПРАКТЫКА

## ЗАНЯТКІ ПАЧЫНАЮЦЦА Ў 8 ГАДЗІН...

На вуліцах яшчэ гараць цьмяныя ліхтары. Іх халоднае святло ледзь-ледзь адсвечваецца ў стылых лужынах. Ранішні вецер схаваўся ў пад'ездах дамоў.

Ад інтэрната на Паркавай магістралі да сярэдняй школы № 48 зусім недалёка. Штодзень спяшаецца сюды Ірына Дварэцкая з сяброўкамі — студэнткамі V курса філалагічнага факультэта. Тут яны праходзяць трохмесячную вытворчую практыку, вядуць урокі ў васьмікласнікаў.

...Тэма заняткаў: двухкроп'е ў бяззлучнікавых сказах. Вучні запісваюць сказы, расстаўляюць знакі прыпынку. Спачатку з дапамогай настаўніцы, а потым ужо самастойна тлумачаць напісанае. Урок — у выглядзе гутаркі. Дэталёва распрацаван студэнткай план. У ім прадугледжаны ўсе асноўныя і дадатковыя пытанні, распісана кожная хвіліна. Дзяўчына вучыцца арганізоўваць і весці заняткі, вучыцца рабіць урокі змястоўнымі і цікавымі.

Непрыкметна праляцелі 45 хвілін. Для школьнікаў урок закончыўся, для Дварэцкай — працягваецца. Ірына абмяркоўвае з метадыстам кожнае сваё слова, запісвае асабістыя назіранні, думкі і меркаванні.

— Я магу назваць 8-ы «А» маім класам,— гаворыць Ірына і доўга расказвае аб сваіх выхаванцах — Наташы Шыяк, Людзе Якаўлевай і іх сябрах.

У канцы мінулай чвэрці Дварэцкая праводзіла класны сход. На ім адбылася шчырая гутарка аб дысцыпліне, вучобе, паводзінах вучняў у школе і дома. Гэтая размова дапамагла Ірыне спасцігнуць характары сваіх вучняў, мікраклімат калектыву класа.

Нядаўна васьмікласнікі разам з настаўніцай-практыканткай наведалі Мастацкі музей БССР, пабывалі ў Вязынцы — на радзіме песняра беларускага народа Янкі Купалы. Кожны тыдзень Ірына Дварэцкая праводзіць палітінфармацыі, расказвае пра гістарычнае мінулае і сённяшні дзень нашай краіны.

— Якія мерапрыемствы больш за ўсё запомніліся вам? — спытаў я васьмікласнікаў.

— Агеньчык «Працай слаўны чалавек», праведзены сумесна з шэфамі з завода халадзільнікаў. У школу прыйшлі ветэраны вайны і працы, настаўнікі моладзі і нашы былыя выпускнікі, якія сёння працуюць на прадпрыемстве. Цяпер з дапамогай Ірыны Уладзіміраўны рыхтуем вечар «Ім было дзевятнаццаць».

А вось размова ў настаўніцкай з арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай работы Н. Саланевіч:

— Ірына — адна з лепшых практыкантак. Калі што-небудзь не атрымліваецца, не саромеецца звяртацца за кансультацыяй. Дзяцей вельмі любіць...

— І дысцыпліна на яе уроках добрая. Вучні паслухмяныя, уважлівыя. З Ірыны атрымаецца добрая настаўніца,— дадае метадыст В. Разумовіч.

Хутка, вельмі хутка настане хвіліна, калі Ірына Дварэцкая пераступіць парог школы паўнапраўнай настаўніцай. А пакуль — толькі практыка. Яшчэ адзін крок да мэты, да будучай прафесіі.

**М. БАЖКО.**

## БЫЦЬ ЧАЛАВЕКАМ

### ПАСЛЯ СПЕКТАКЛЯ

Кожная новая пастаноўка студэнцкага тэатра — свята. Узноўлены спектакль — двайное свята.

П'еса чэхаславацкага драматурга Карэла Чапэка «Маці» — твор вельмі своеасаблівы як па форме, так і па зместу. На сцэне студтэатра мы ўбачылі яго ў 1975 годзе. І вось сёлета заслужаны артыст Латвійскай ССР А. М. Озераў пасля пастаноўкі «Рамэо і Джульеты» Шэкспіра зноў звярнуўся да «Маці». П'еса гэта ставіць многа вечна сучасных праблем: асабістае жыццё і абавязак перад Радзімай, праблема сумлення і гонару, бацькоўскай любві...

Маці — абагульнены вобраз усіх маці чалавечых. Імя яе на працягу ўсяго дзеяння нават не ўпамінаецца.

Н. Пякарскай вельмі ўдаўся гэты вобраз. Не выкарыстоўваючы шырокі арсенал артыстычных сродкаў, яна змагла стварыць на сцэне і канкрэтную асобу, і сімвал. Памятаеце інтанацыю, з якой яна гаворыць: «Мы, маці, ніякіх войнаў не вялі... Мы толькі разлічваліся за іх сваімі дзецьмі...»

У гэтых словах—ідэя выдатнага антываеннага твора, якім з'яўляецца п'еса К. Чапэка.

Апошняя сцэна. Збіраюцца ўсе здані: дзядуля, бацька, сыны — Ондра, Пётр, Карнэль. Бацька загінуў за гонар афіцэра. Ондра памёр за навуку, Іржы — за тэхнічны прагрэс, Пётр — за свабоду і роўнасць, Карнэль — «за парадак і дабраты нацыі». Усе, акрамя Карнэля, сабраліся, каб угаварыць Маці адпусціць малодшага, Тоні, які рвецца змагацца за свабоду і роўнасць.

— Цана жыцця і заключаецца ў тым, што за яго часам плаціць патрэбна... нават самім жыццём...

Словы дзядулі не даюць спакою Маці. Паступова яна разумее, што міру нельга дабіцца, знаходзячыся ў баку ад барацьбы і замкнуўшыся ў коле сям'і. Чалавек, каб быць Чалавекам, павінен абараніць сваю годнасць, павінен быць у адказе за ўсё на свеце.

**В. ГЕДРОЙЦ,**
**студэнт журфака.**

## МУЗЫКА І САЦЫЯЛОГІЯ

Сацыялогія ў мастацтве... Некалькі дзіўна гучыць. Тым не менш сустрэча студэнтаў факультэта журналістыкі з музычным рэжысёрам Рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага Аляксандрам Рэнанскім была прысвечана іменна гэтаму.

Размова аб пытаннях музычнага афармлення спектакляў, аб неабходнасці музыкі для расшырэння рамак уздзеяння сцэны, для лепшага разумення думак і мэт аўтараў драматычных твораў заўсёды жывая і цікавая. З вялікім інтарэсам студэнты слухалі чалавека, улюбёнага ў сваю прафесію. А. Рэнанскі не выказваў закончаных безапеляцыйных меркаванняў, ідэй, а даваў пажыву нашаму творчаму ўяўленню, прымушаючы «пераварыць» увесь гэты кангламерат музычных плыняў, светапоглядаў і знайсці ў творчай «звалцы» брыльянты велізарнай цаны і важнасці, адкінуўшы безаблічныя вырабы...

А. Рэнанскі расказаў, што сацыялогія музыкі як навука праявілася ў сярэдзіне XIX стагоддзя ў Францыі, але не атрымала распаўсюджання і была забыта да 20-х гадоў нашага стагоддзя. Ён коратка асвятліў пытанне, што даследуе сацыялогія і якое значэнне яна адыгрывае ў нашым жыцці. Аказалася, што гэта навука займаецца распрацоўкай вельмі важных праблем: чаму мы купляем і слухаем тую ці іншую пласцінку, а іншыя гукі, рытмы пакідаюць нас абыякавымі; як распаўсюджваецца музыка ў розных сацыяльных групах насельніцтва і засвойваецца імі; якая структура і форма мастацтва ў розных краінах свету. Асвятленне тэарэтычных пытанняў спалучалася з праслухоўваннем сюжак з запісам Мусаргскага ў выкананні групы «ЭЛП» як прыкладу зліцця сучаснага электрамузычнага малюнка з асновай класічнага твора.

Усяго тры гадзіны — і маса ўражанняў, пашырэнне нашага ўспрымання розных плыняў у музыцы, думкі аб неабходнасці іх дасканалага вывучэння.

**А. ГАЙДУК,**
**студэнт журфака.**





За детство счастливое наше
Спасибо, родная страна.
Фота А. БАСАВА.



## УСМЕШКА

— Насочкі, насочкі цягніце!

— Света, ну ўсміхніся ж!

Кіраўнік танцавальнага гуртка па хімфаку Галіна Цалавальнікава (рабяты завуць яе—наша Галя), строгая, як заўсёды, падцягнутая. У яе вачах загараецца агеньчык радасці пры кожным дакладна выкананым руху, кожную няўдачу перажывае яна разам з рабятамі.

Танцавальны гурток на хімічным факультэце быў створаны ў мінулым годзе. Жадаючых паспрабаваць свае сілы было многа. Зусім без навыкаў, несабраныя, нязграбныя, рабяты з надзеяй глядзелі на свайго маладога кіраўніка.

— Працаваць у самым пачатку даводзілася многа. Ва ўсіх, хто сюды прыйшоў, не было нічога, акрамя гарачага жадання танцаваць, — успамінае Галя.

Тым, хто заглядваў у залу для рэпетыцый, не верылася, што з гэтых рабят і дзяўчат выйдзе толк. Яны былі такія розныя, кожны сам па сабе. Не адразу пасялілася ў калектыве дружба, не адразу прыйшоў першы поспех. Галя не адчайвалася, памятала, якой сама калісьці прыйшла ва універсітэцкі ансамбль народнага танца «Крыжачок». Упэўнена і спакойна праводзіла яна першыя ўрокі па «класіцы», развучвала з удзельнікамі танцавальныя рухі, вучыла трымацца на сцэне.

У першы нумар рабяты ўклалі ўвесь свой запал. На універсітэцкім аглядзе мастацкай самадзейнасці яны тады выканалі танец «Крыжачок». І вось тут іх упершыню заўважылі! А самі рабяты заўважылі раптам, наколькі пасябравалі за гэты час. Цяпер яны прыходзілі на рэпетыцыі як да сябе дадому, як на цікавую сустрэчу, як на спатканне з сябрам. Паявіліся ў калектыве свае традыцыі, свае агульныя інтарэсы. У гэтым вялікая заслуга Галіны Цалавальнікавай.

— На рэпетыцыях у Галіны Міхайлаўны заўсёды «жалезная» дысцыпліна. Яна не любіць несабранасці, расхлябанасці, — гаворыць староста гуртка трэцякурснік Толя Сялевіч.

У вачах студэнткі IV курса Галі Ажар смяшынкі:

— Затое пасля рэпетыцыі яна зусім іншая. Мы разам спрачаемся аб новых фільмах, вандруем па горадзе...

На летніх канікулах ніхто з удзельнікаў гуртка не кінуў заняткаў, а Толя Сялевіч нават выступаў у агітбрыгадзе.

І вось яны зноў разам. Калектыў папоўніўся новымі членамі. Паявілася яшчэ больш клопатаў і ў кіраўніка, і ў рабят. Затое цяпер яны танцуюць ужо ў 10 пар. Ёсць планы на будучае.

— Мы марым падрыхтаваць маленькую праграму беларускіх танцаў, — расказвае Цалавальнікава.

Наперадзе — новы агляд мастацкай самадзейнасці БДУ. На дзяўчат і рабят з танцавальнага на факультэце спадзяюцца. Ідуць рэпетыцыі — вольнага часу не хапае. У Галіны — любімая работа (яна інжынер-хімік на кафедры хімфака), у рабят — лекцыі, семінары. Але рэпетыцыі наведваюць рэгулярна. І калі не прыйшоў хтосьці адзін — трывожацца ўсе.

...З нядаўніх часоў на факультэцкіх вечарах часта гучыць цікавая, бурлівая мелодыя «Крыжачка» і «Юрачкі», а са сцэны ўсміхаюцца гледачам вясёлыя танцоры. І свой калектыў яны хочуць назваць—«Усмешка».

**Г. ПУПЕЙКА.**

В. а. рэдактара В. А. ВОЛЬСКІ

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз.

Аб'ём — 1,5 друк. ар. АТ 04643 Заказ № 16.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 32-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.